# Журналістыка

В. І. ДУБОВІК

## РАЁННАЯ ГАЗЕТА ЯК ТЫП ВЫДАННЯ

Раённая газета мае больш чым паўвекавую гісторыю, якая цесна звязана з агульным працэсам станаўлення савецкага друку. Разам з тым яна — выданне асаблівае, са сваёй спецыфікай, што абумоўлена яе самабытнымі функцыямі і шляхамі іх рэалізацыі, а таксама своеасаблівасцю матэрыялу і чытацкай аўдыторыі.

Функцыі раённай газеты заключаюцца «ў прыцягненні рабоча-сялянскай масы ў агульную работу будаўніцтва палітычна-гаспадарчага жыцця»[1]. Адсюль з поўнай верагоднасцю і логікай напрошваецца вывад: гэты сродак масавай інфармацыі і прапаганды на справе павінен быць трыбунай і стваральнікам грамадскай думкі і ва ўзаемадзеянні з іншымі мясцовымі сацыяльнымі інстытутамі — рычагом кіравання ўсімі працэсамі развіцця раёна.

У адрозненне ад сваёй папярэдніцы — павятовай газеты, якая задавальнялася мінімумам тэм (сельская гаспадарка і побыт вёскі, партыйнае, рабочае і прафесійнае жыццё, прамысловасць і кустарныя промыслы), «раёнка» з самых першых крокаў асвойвае новыя тэмы: барацьба з ухіламі ў партыі, індустрыялізацыя і калектывізацыя, абарона краіны, прафсаюзы і ўмацаванне працоўнай дысцыпліны, сацспаборніцтва і ўздым прадукцыйнасці працы, Саветы і дзейнасць навучальных устаноў, ачагоў культуры, удзел працоўных у грамадскіх мерапрыемствах, у мастацкай і тэхнічнай творчасці, спорце.

Нельга не заўважыць таксама, што калі спачатку (у 30-я гады і напярэдадні вайны) у афіцыйных дакументах неаднаразова падкрэслівалася, што раённая газета павінна вызначацца вытворчым характарам, што яна заклікае адлюстроўваць вытворчыя асаблівасці і эканоміку раёна, то потым (адразу пасля вайны і бліжэй да нашых дзён) яна паступова паварочваецца тварам у бок невытворчай сферы, сацкультбыту, павышаецца яе роля ў ідэалагічным забеспячэнні поспехаў ва ўсіх галінах. Пры гэтым «асаблівая ўвага» ўдзяляецца «пытанням умацавання камуністычнай перакананасці, выхавання пачуцця савецкага патрыятызму і сацыялістычнага інтэрнацыяналізму ў кожнага савецкага чалавека, ідэйнай стойкасці і ўмення супрацьстаяць любым формам буржуазнага ўплыву»[2].

**На якім матэрыяле** лепш за ўсё выконваць «раёнцы» свае задачы? Адказ на гэта пытанне літаральна ва ўсіх рашэннях партыі аб друку аднзначны і нават амаль тэкстуальна супадаючы — пераважна на **мясцовым** матэрыяле, абапіраючыся на «канкрэтныя, блізкія і зразумелыя факты з мясцовай практыкі, з жыцця свайго раёна, калгасаў, прадпрыемстваў»[3]. Іншымі словамі, райгазета апраўдае сваё высокае прызначэнне толькі тады, калі будзе выступаць на злабадзённыя тэмы, выкарыстоўваць фактычныя прыклады, спасылацца на падзеі, з'явы, выпадкі, вядомыя пераважнай большасці тутэйшых жыхароў, калі будзе браць інфармацыю «з першых рук», тую, якую нельга атрымаць з іншых каналаў, і досыць дакладную, прадметна акрэсленую.

**Каму павінна адрасавацца раённая газета,** з кім размаўляць, на каго арыентавацца? Яна гістарычна складвалася як газета, разлічаная галоў-

ным чынам на чытача-**селяніна**, як газета, якая пераважную частку сваёй плошчы павінна ўдзяляць вёсцы. Статус «калгаснай газеты»[4], максімальна набліжанай да калгасна-саўгаснай вытворчасці і да вясковага чытача, захаваўся за ёй дагэтуль. А гэта азначае, што першачарговы яе «аб'ект» — сельская гаспадарка, першы яе «адрасат» — працаўнікі палёў, ферм, майстэрань. Менавіта да іх (даярак, свінарак, аратых, слесараў, токараў) газета павінна непасрэдна звяртацца, менавіта на іх разуменне і падтрымку спадзявацца.

Нарэшце, якой выглядае «раёнка» **па сваім абліччы, па сукупнасці прыкмет, уласцівасцей, па знешніх абрысах?** У рэзалюцыях партыйных з'ездаў, у цыркулярах і пастановах ЦК наконт гэтага гаворыцца наступнае: яна павінна мець на ўвазе амаль выключна масавага чытача і таму весціся жыва і папулярна. Дзелавіты, канкрэтны і просты, блізкі інтарэсам мас змест яе павінен быць зразумелым па выкладанню. Артыкулы і заметкі, а таксама і самі фразы павінны быць кароткія, пабудаваныя па ясным, дакладным плане. Асноўная думка і сутнасць кожнага публікуемага матэрыялу павінны быць выказаны выразна, малавядомыя факты і незнаёмыя геаграфічныя імёны і назвы — вытлумачаны і расталкаваны. Рэдакцыям неабходна праяўляць больш клопатаў аб жанравай «палітры», а таксама і цікавасці сваіх выступленняў [5].

Наўрад ці гэтыя ўказанні маюць патрэбу ў каментарыях. Для ўсіх нас з першага ж позірку на тэкст відавочна, што тыповай рысай раённых газет з'яўляецца **масавасць** (у сэнсе шырыні ахопу аўдыторыі і «зваротнай сувязі» з ёй) і **папулярнасць** (у сэнсе даходлівасці, «чытабельнасці» публікацый як па зместу, так і па форме). Таму партыя няўхільна патрабуе ад мясцовых журналістаў: 1) паляпшаць работу з пісьмамі ў рэдакцыю, з рабселькорамі і пазаштатным аўтарскім актывам; 2) улічваць агульнаадукацыйны і культурны кругагляд чытачоў, спецыфіку іх вытворчых, духоўных, бытавых і ўзроставых інтарэсаў; 3) удасканальваць прафесійнае майстэрства. З прычыны малалікасці штатнага апарату гэтыя прэтэнзіі для «раёншчыкаў» аказваюцца больш вострымі, чым для супрацоўнікаў «вялікіх» газет.

На падставе рэтраспектыўнага агляду шматлікіх партыйна-палітычных дырэктыў мы можам зрабіць наступны вывад. «Раёнка» — гэта газета, папершае, выключна **мясцовая**: яна хутка паведамляе пра ўсё, што адбываецца ў тым рэгіёне, дзе выходзіць і распаўсюджваецца; адлюстроўвае клопаты, думкі і настрой тутэйшага насельніцтва; уплывае на абстаноўку і становішча спраў у межах дадзенай тэрыторыі; менавіта ў гэтых межах дзейсныя яе заўвагі, крытыка, парады, прапановы, рэкамендацыі.

«Раёнка» — гэта газета, па-другое, **агульнадаступная**: яе задумы правільна ўспрымаюцца самымі шырокімі коламі, бо яна расказвае аб зразумелых з'явах на ўзроўні гаспадаркі, брыгады, сям'і, прытым — у такіх дэталях і падрабязнасцях, якія былі б недапушчальнай раскошаю ў цэнтральным друку; довады яе пераканальныя і зразумелыя, мова простая, блізкая да гутарковай вясковай мовы.

«Раёнка» — гэта газета, па-трэцяе, **свая, родная,** таму што яна паяўляецца на свет у выніку самага непасрэднага і самага актыўнага ўдзелу чытачоў, грамадскіх (народных) карэспандэнтаў. Увогуле, «раёнку» можна лічыць самай **аператыўнай,** сапраўды **масавай** і **папулярнай** газетай, бо яна бліжэй за іншых стаіць да рэчаіснасці і да свайго чытача, што забяспечвае ёй магчымасць заўсёды быць у гушчыні народнага жыцця, даходзіць да **кожнага** чалавека і рабіць радавога працаўніка галоўнай дзеючай асобай («героем») сваіх твораў. Яе прыярытэтнае прызначэнне як папулярнай палітычнай газеты, масавага **палітычнага** органа — іграць ролю калектыўнага прапагандыста, **агітатара** і **арганізатара** працоўных, дапамагаць мясцоваму камітэту партыі і Савету народных дэпутатаў вырашаць надзённыя задачы.

Сёння, ва ўмовах рэвалюцыйнага абнаўлення ўсіх бакоў нашага жыцця: эканомікі, палітыкі, ідэалогіі, культуры, стылю і метадаў партработы, ва ўмовах дэмакратыі і галоснасці, якія ўсё пашыраюцца, ва ўмовах самакіравання народа, калі менавіта ў «нізы» змяшчаецца цэнтр цяжару радыкальных рэформ, калі менавіта ў працоўных калектывах праходзіць передавая лінія барацьбы за паскарэнне перамен, калі да раённага і гарадскога звяна нашай савецкай сістэмы прыкавана ўвага партыі і яе прэсы, раённыя газеты выстаўляюцца на пярэдні край перабудовы.

У заключэнне хачу прапанаваць аптымальную мадэль раённай газеты, якая адпавядала б патрабаванням часу.

Газета складаецца з **кароткіх** і **жыва** напісаных матэрыялаў — з такім разлікам, каб стомлены працаўнік змог усю яе прачытаць прыкладна за гадзіну. **Перадавіца** падаецца ў выглядзе сардэчнай, шчырай гаворкі, можа, нават ад імя канкрэтнай асобы, аб самым надзённым у дадзены момант і ў дадзенай мясцовасці. **Выступленні** палітычных дзеячаў, **прамовы** кіраўнікоў, афіцыйныя **дакументы** ідуць у простым і ясным выкладанні, якое адзначае толькі самае галоўнае, новае. З нумара ў нумар змяшчаецца аператыўная і разнастайная (палітычная, эканамічная, прафесійная, эстэтычная, даведачная і інш.) **інфармацыя**. Буйнейшыя **міжнародныя падзеі** перыядычна асвятляюцца ў талковых аглядах і «калонках каментатара». **Прапаганда** прыкладных ведаў і жыццёвай вопытнасці, навуковых метадаў работы і дасягненняў майстроў справы вядзецца ў пастаяннай рубрыцы «Трыбуна перадавіка». **Крытычны аналіз** становішча на месцах робіцца ў смелых і грунтоўных карэспандэнцыях і артыкулах спецыялістаў, партыйных і савецкіх работнікаў, журналістаў. Рэгулярна друкуюцца папулярныя «Гутаркі аб выхаванні» (дзяцей і моладзі), «Парады гаспадару (гаспадыні)» (пра асабістае жыццё, побыт, добраўпарадкаванне і г. д.) — для **сямейнага** чытання. У нядзельным нумары пажаданы цікавы нарыс або апавяданне, фельетон ці гумарэска, нават раёшнік (з казкамі, рэбусамі, загадкамі, народнымі прыкметамі) — для **адпачынку**. Ну і абавязкова павінны быць **рэклама, аб'явы.**

Вядома, магчымы варыянты, але галоўнае заключаецца ў тым, што **свая** газета, якая была б надзейным памочнікам партыйных і савецкіх органаў, з якімі яна адной справай занятая і б'е ў адну кропку. Газета, якая выдаецца ў раёне, не можа быць копіяй ні цэнтральнай, ні абласной. Няхай яна раўняецца на іх, вучыцца ў іх, пераймае іх вопыт — гэта звычайная рэч, але няхай будзе раённай у самым лепшым сэнсе гэтага слова. І другое: каб быць на вышыні прынцыповых патрабаванняў, якія загучалі па-новаму ва ўмовах перабудовы, «раёнцы» трэба няўхільна імкнуцца да тэматычнай разнастайнасці, без баязлівасці, без аглядкі на «начальства» брацца за «балючыя», «вострыя» пытанні, рашуча пераходзіць ад інфармацыйнасці і канстатавання да аналітычнасці і канструктыўнасці, адмаўляцца ад параднасці і алілуйшчыны, рабіць праўду законам свайго жыцця, нястомна, мужна дамагацца дзейснасці і эфектыўнасці публікацый. Зразумела, пры гэтым прыдзецца ўзняць літаратурны ўзровень творчасці, пашырыць жанравы набор.

Няма сумнення, што такую газету падпісчыкі будуць чакаць і разгортваць з нецярпеннем: «А што сёння пішуць пра нас і для нас?» Такая газета будзе сапраўдным сябрам і дарадцам чалавека працы, які з'яўляецца прарабам перабудовы.

[1] КПСС о средствах массовой информации и пропаганды. М., 1979. С. 58.
[2] Там жа. С. 288.
[3] Там жа. С. 173.
[4] Гл.: Там жа. С. 216.
[5] Гл.: Там жа. С. 56—57; 60—61; 289.

Б. В. СТРАЛЬЦОЎ

## РАЁННАЯ ГАЗЕТА Ў СІСТЭМЕ КІРАВАННЯ

Прыярытэтныя напрамкі і спецыфіка дзейнасці раённага друку дакладна вызначаны пры яго стварэнні і зафіксаваны ў пастанове ЦК ВКП(б) «Аб рэарганізацыі сеткі газет у сувязі з ліквідацыяй акруг» (11 жніўня 1930 года): «Раённая газета павінна быць масавым палітычным органам і павінна мець яскрава праяўлены вытворчы характар (у адпаведнасці з эканомікай пэўнага раёна)»[1]. З гэтага недвухсэнсава вынікае, што раённая газета ад самага пачатку ўключалася ў палітычную сістэму кіравання сваім рэгіёнам, станавілася неад'емнай часткай гэтай сістэмы.

За дзесяцігоддзі, што мінулі ад моманту заснавання нізавога звяна партыйна-савецкага друку, кіраўніцкая функцыя раённай газеты, гэтак жа як і іншых сродкаў масавай інфармацыі і прапаганды, выразна акрэслілася і праявілася па ўсім дыяпазоне ленінскай трыяды: «Газета — не толькі калектыўны прапагандыст і калектыўны агітатар, але таксама і калектыўны арганізатар»[2]. Аднак было ў гэтай справе і істотнае абмежаванне. Існавала афіцыйная ўстаноўка, згодна якой сродкі масавай інфар-